**Кантрольная работа (дыктант)**
**для правядзення ўступных іспытаў пры прыёме асоб у VIII клас**
**для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі у кадэцкіх вучылішчах**
**па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»**

Лета набірае сілы

Лета набірае сілы.

Гамоняць пад ціхімі павевамі ветру лёгкія каласы з жоўтымі пяшчотнымі завушніцамі на іх. Яны нібы цягнуцца да празрыстага неба і просяць спагады ў прыгожыя часы свайго красавання. І хоць няма ні зярняці ва ўсім гэтым хвалюючым моры, а ўжо чуецца ледзь-ледзь хлебны пах, які так прыемна казыча ноздры.

Больш як у другую пару года ўпрыгожана зямля ў гэты час. У які бок ні пойдзеш, усё гамоніць з табою. Густы цёмна-зялёны ячмень з сінім налётам фанабэрыста распускае пушыстыя вусы. Авёс шамаціць галінкамі, нібы адмысловымі празрыстымі каралямі. Доўгімі зялёнымі шнурамі выцягнулася бульба. Толькі расплюшчвае блакітныя вочы лён, а на сенажацях кветак, што і не пералічыць... (109 слоў)

*Паводле П. Броўкі*